# «Новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі расце літаральна на вачах...»

## *Заўтра — Дзень работнікаў культуры*

**Напярэдадні свята ў Міністэрстве культуры Беларусі адбылася сустрэча вядомых дзеячаў культуры з супрацоўнікамі сродкаў масавай інфармацыі.**

У Беларусі працуе каля 13 тысяч устаноў культуры і мастацтва, налічваецца больш як 350 устаноў новага тыпу (бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-музеі, бібліятэкі-дамы народнай медыцыны, дамы сацыяльных паслуг) і 357 цэнтралізаваных клубных сістэм, з іх 97 працэнтаў — у сельскай мясцовасці. На адраджэнне традыцый народнага мастацтва накіравана работа 62 Дамоў рамёстваў, 56 Дамоў фальклору і школ народнай творчасці.

**Намеснік Міністра культуры Рэспублікі Беларусь Валерый ГЕДРОЙЦ** адзначыў, што сёлетні Дзень работнікаў культуры праходзіць у знакавы для нашай краіны год 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — для правядзення святочных мерапрыемстваў, стварэння новых твораў мастацтва, прысвечаных подзвігу народа, прыкладзена нямала сіл і таленту з боку ўсіх работнікаў сферы культуры. У прыватнасці, на Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» завершана работа над новай стужкай «Яшчэ раз пра вайну», завяршаецца работа над фільмамі «Вам заданне», «Лясная балада». Шэраг масавых мерапрыемстваў, музычна-літаратурных вечарын, сустрэч з ветэранамі, выставак і аглядаў прайшоў у самых масавых установах — музеях і бібліятэках.

«Патэнцыял культуры павялічыўся. У час святкавання Дня горада ў адным з мікрараёнаў сталіцы была адкрыта новая бібліятэка. Зусім нядаўна ў Гомелі прыняў наведвальнікаў адрэстаўраваны Палац Румянцавых-Паскевічаў. У Магілёве адкрыўся вельмі цікавы музей этнаграфіі.

Мы выйшлі на 55-метровую адзнаку будаўніцтва новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі. Як вядома, агульная вышыня будынка будзе складаць 72,6 метра. Спадзяюся, што ў наступны Дзень работнікаў культуры правядзём экскурсію ў новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі.

14 кастрычніка мы запросім работнікаў культуры з усіх рэгіёнаў нашай краіны, каб павіншаваць, адзначыць узнагародамі, — у аднаўлены будынак Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Амаль што два гады праводзіўся капітальны рамонт галоўнай сцэнічнай пляцоўкі рэспублікі — яна стала вельмі зручнай як для артыстаў, так і для гледачоў», — падкрэсліў Валерый Карлавіч.

У нас шмат творчых дасягненняў, якімі можна ганарыцца. Дзякуючы падтрымцы дзяржавы праводзіцца мноства разнастайных фестываляў, конкурсаў, аглядаў, святаў мастацтва рэспубліканскага і міжнароднага ўзроўню. Усё часцей прадстаўнікі беларускай культуры бяруць удзел у міжнародных конкурсах — і вяртаюцца адтуль з узнагародамі самага высокага гатунку.

У Беларусі сфарміравана і паспяхова развіваецца шматступеньчатая дзяржаўная сістэма выяўлення талентаў, асновай якой з'яўляецца Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. На фінансаванне расходаў, звязаных з дзейнасцю фонду, у 2003 г. было выдзелена 600 млн. рублёў. Самым распаўсюджаным відам падтрымкі таленавітай моладзі стала назначэнне стыпендый і аказанне матэрыяльнай дапамогі. У параўнанні з 2001 годам больш чым у два разы павялічылася колькасць стыпендыятаў спецыяльнага фонду. Калі ў 2001 годзе іх было 85, то ў 2003-м, з улікам заахвочвальных прэмій выпускнікам і імянных прэмій, іх стала 192. Упершыню стыпендыі выплачваліся штомесячна на працягу ўсяго года. У залежнасці ад узроставай катэгорыі стыпендыя складала ад трох да пяці базавых велічынь заработнай платы. У мінулым годзе заахвочванні спецыяльнага фонду атрымалі 253 чалавекі, на выплату якіх выдаткавана 123 млн. 247 тыс. рублёў. А ўвогуле за час дзейнасці фонду звыш адной тысячы маладых талентаў атрымалі фінансавую падтрымку, больш як 700 лаўрэатаў рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў сталі яго стыпендыятамі.

Беларускае мастацтва, нацыянальная культура цікавыя не толькі айчынным прыхільнікам, яны канкурэнтаздольныя і за мяжой. Больш чым з 30 краінамі свету заключаны міждзяржаўныя і міжведамасныя дамовы, у адпаведнасці з якімі вядзецца плённае міжнароднае культурнае супрацоўніцтва.

Калі 2004 год стаў Годам Беларусі ў Расіі, то 2005 год будзе Годам Расіі ў Беларусі.

І яшчэ досыць красамоўная лічба. У гэтым годзе на развіццё культуры было выдаткавана 0,45 працэнта ўнутранага валавога прадукту, а на наступны год плануецца 0,5 працэнта. Здавалася б, і невялікае павелічэнне, але лічба для ведамства даволі ўнушальная, сказаў В. Гедройц.

**Дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ** адзначыў, што бібліятэкары — найбольш шматлікая кагорта ў галіне работнікаў культуры. Зараз у Беларусі больш за 10 тысяч бібліятэк, у іх фондах налічваецца каля 200 млн. экзэмпляраў розных відаў носьбітаў інфармацыі па ўсіх аспектах ведаў.

«Зараз наша бібліятэка працуе ў вельмі актыўным рытме: ужо менш чым праз 11 месяцаў павінен быць здадзены ў эксплуатацыю новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі, — сказаў Раман Сцяпанавіч. — Мы працягваем працаваць у традыцыйным рэжыме, фарміраваць інфармацыйныя рэсурсы, абслугоўваць карыстальнікаў і паралельна вельмі актыўна працуем з праектнымі арганізацыямі па праектаванню новага будынка, у першую чаргу — інфармацыйна-тэхналагічнай часткі. Рыхтуемся і да перамяшчэння нашых фондаў у памяшканне новага будынка. Новае памяшканне бібліятэкі будзе не толькі і не столькі кнігасховішчам, колькі сучасным інфармацыйным цэнтрам».

Новы будынак бібліятэкі зараз расце літаральна на вачах...

**Старшыня савета дырэктараў рэспубліканскіх і абласных музеяў, дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда КАМАРОЎСКАЯ** гаварыла пра вялікую ролю музеяў у вывучэнні і асэнсаванні гісторыі і культуры Беларусі, у выхаванні нацыянальнай самасвядомасці грамадзян Беларусі, далучэнні іх да культурнай спадчыны. Практычна штогод у краіне адкрываюцца новыя музеі, цікавы музей сёлета адкрыўся не толькі ў Магілёве, але і ў Полацку — дзіцячы музей. Інтэнсіўна развіваецца выставачная дзейнасць (за год адкрываецца каля 1500 выставак самай рознай тэматыкі). У бліжэйшай перспектыве — асваенне новых інфармацыйных тэхналогій усімі музеямі краіны, стварэнне Дзяржаўнага зводнага каталога.

**Дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Генадзь ДАВЫДЗЬКА:**

— Тое, што наша дзяржава ў шосты раз адзначае свята работнікаў культуры, сведчыць пра тое, што да культуры стаўленне не штучнае, а вельмі сур'ёзнае. Кіраўніцтва дзяржавы разумее існуючыя праблемы культуры — і важнасць культуры... Магу прапанаваць такую метафару: чалавек жыве дзякуючы крыві, кроў можна параўнаць з эканомікай. Добрая эканоміка — гэта добрая кроў. Але культура — гэта галава. І навошта нам здаровы дзяцюк без галавы?.. Без культуры не будзе нічога, немагчымы ні эканамічныя, ні палітычныя дасягненні... Усё, што застаецца ад цывілізацыі, — гэта культура.

Генадзь Давыдзька адзначыў, што ўвага дзяржавы да тэатральных праблем вельмі вялікая — гэта ўжо не проста ўвага, а дбайнае супрацоўніцтва. За апошнія гады ёсць чым ганарыцца ўсім тэатрам Беларусі. «Не ведаю, ці ёсць у Еўропе краіна, дзе не пабывалі б нашы тэатральныя калектывы. Нас пазнаюць... Дарэчы, толькі за апошнія два месяцы тэатр імя Я. Купалы, дзякуючы дзяржаўнай падтрымцы, пабываў са спектаклямі ў чатырох краінах, і водгукі тамтэйшай крытыкі вельмі станоўчыя. Зараз наша трупа знаходзіцца на фестывалі ў Любліне. А перад тым — Кіеў, Масква, Санкт-Пецярбург. Сённяшнія факты рэчаіснасці сведчаць пра тое, што культура жыве — і жыве Беларусь».

Генадзь Давыдзька выказаўся і адносна апошняй заявы ЗША пра эканамічныя санкцыі супраць Беларусі: «Уявіце сітуацыю: нехта зранку любіць есці яешню, а я люблю аўсянку. Дык што, хіба сусед з іншым густам павінен настойваць, каб мне адключылі святло і ваду? Хіба мае хто такое права? Не!.. Я глыбока ўзрушаны апошнімі палітычнымі заявамі, зараз будзе ўзмацняцца ўся гэта брудная... не пабаюся гэтага слова — вайна, гвалт».

На сустрэчы ў міністэрстве культуры таксама ішла размова пра тое, што распрацаваны і працуюць дзяржаўныя праграмы захавання бесперапыннасці культурнага працэсу і яго нацыянальнай самабытнасці, забеспячэння даступнасці дасягненняў нацыянальнай культуры ва ўсёй разнастайнасці накірункаў, формаў, жанраў і стыляў, развіцця ў падрастаючага пакалення эстэтычнага кругагляду.

Мне падаецца, што словы, якія сёння гавораць многія: «Будынак Нацыянальнай бібліятэкі расце на вачах»... — можна без перабольшання назваць сімвалічнымі для сучаснага стану нацыянальнай культуры наогул.

**Таццяна ПАДАЛЯК.**